**ГАЗІН Васілій Пятровіч.** Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся ў 1920 г. у с. Шоўскае Лебядзянскага раёна Ліпецкай вобласці ў сям'і селяніна. Рускі. Закончыў курсы трактарыстаў. У Чырвонай арміі з 1939 г. Служыў у Беларусі на граніцы. У час Вялікай Айчыннай вайны 27.7.1941 г. трапіў у палон. Уцёк з лагера, з 14.7.1942 г. ваяваў у партызанскай брыгадзе імя Р.І.Катоўскага. З 26.6.1944 г. стралок 1293-га стралковага палка 160-й стралковай дывізіі 70-й арміі 1-га Беларускага фронту. 18.7.1944 г. у баі каля хутара Бяроза недалёка ад с. Самары Ратнаўскага раёна Валынскай вобласці радавы Газін здзейсніў подзвіг: грудзьмі закрыў варожы кулямёт, што дало магчымасць таварышам рухацца наперад. Пахаваны на скрыжаванні дарог на поўдзень ад в. Язоўня Ратнаўскага раёна. Яго імем названы вуліцы ў гарадах Ліпецк і Ратна. У г. Ратна ўстаноўлены яго бюст.



В.П.Газін.